ніках і інш. Думаю, што чытач не без задавальнення пазнаёміцца і з афарыстычнымі выказваннямі аб мове навукі розных вучоных, сярод якіх Л. Сенека, Л. да Вінчы, Г. Галілей, І. Кант, вядомыя сучасныя мовазнаўцы.

Напісаныя эмацыянальна і шчыра, з прыцягненнем як значнага фактычнага матэрыялу, так і шматлікіх навуковых прац славянскіх тэрміналагаў, кнігі С. Гайды, нягледзячы на гіпатэтычны характар некаторых палажэнняў, зацікавяць усіх, каго хвалююць праблемы навуковай тэрміналогіі.

**М. Р. Прыгодзіч**

І. П. Чыгрын. **Рэальнае і магчымае: Проза Якуба Коласа.** Мн.: Навука і тэхніка, 1991. 222 с.

У новым даследаванні І. П. Чыгрын працягвае гаворку аб праблеме станаўлення беларускай прозы як мастацтва слова, распачатую ім у папярэдніх кнігах — «Проза «Маладняка»: Дарогамі сцвярджэння (1985) і «Крокі: Проза «Узвышша» (1989). Аўтар заўважае, што яго новая праца ў пэўным сэнсе з'яўляецца заключнай, абагульняючай часткай цыкла.

Даследчык удумліва прачытаў цікавыя, у многім яшчэ недастаткова распрацаваныя старонкі беларускай літаратуры, засяродзіў увагу на характарыстыцы такіх твораў Якуба Коласа, як апавяданні, «Казкі жыцця» і трылогія «На ростанях» (раздзелы «У жанры рэалістычнага апавядання», «На ўзроўні алегорыі», «Прастора раманнай формы і трылогія «На ростанях»).

Прозу Якуба Коласа І. П. Чыгрын разглядае ў кантэксце як беларускай літаратуры XX ст., так і сусветнай літаратуры, паказвае творчую эвалюцыю пісьменніка, раскрывае непаўторнасць яго мастацкага свету. Нельга не пагадзіцца з даследчыкам, калі ён сцвярджае, што пры ўсіх поспехах у дакастрычніцкі перыяд развіцця беларуская проза толькі пачынала афармляцца ў мастацкае слова, што адзіным жанрам, у якім яна так ці інакш здолела сябе праявіць, быў жанр апавядання. Да аповесці, тым больш да рамана,— рабіліся толькі першыя подступы.

Прааналізаваны матэрыял дазволіў І. П. Чыгрыну зрабіць вывад, што коласавы рэалістычныя апавяданні дарэвалюцыйнай пары адрозніваюцца ад апавяданняў савецкага часу, па-першае, моцнай сувяззю з фальклорам і, па-другое, большай мастацкай мабільнасцю, жанравай неаднароднасцю. Сапраўды, народная творчасць была для пісьменніка не толькі крыніцай натхнення, але своеасаблівай стартавай пляцоўкай на шляху да прафесійнага мастацтва. Сапраўды, у яго дарэвалюцыйнай прозе, апрача ўзораў псіхалагічнага апавядання («Нёманаў дар», «Малады дубок»), твораў бытавога плана («Кірмаш»), філасофскай скіраванасці («У старых дубах»), можна сустрэць звычайную замалёўку (многія апавяданні для «Другога чытання для дзяцей беларусаў»), роздум з выпадку («Думкі ў дарозе», «У горадзе»), спробу эпічнай формы расказу («Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле»), жанравую сцэнку («Стараста»), зварот да такой разнавіднасці малой прозы, як анекдот ці нешта блізкае да яго («Слабода, «Злавіў»).

У кнізе характарызуюцца і высока ацэньваюцца такія апавяданні савецкага часу, як «Пракурор», «У двары пана Тарбецкага», «Хатка над балотцам» і інш., адзначаецца пры гэтым, што пераважная большасць іх была створана ў 20-я гады, што часы культу асобы Сталіна адмоўна ўплывалі на творчае развіццё пісьменніка.

І. П. Чыгрын на высокім прафесійным узроўні характарызуе апавяданні Якуба Коласа. Аднак якраз у гэтым раздзеле ён у асобных момантах не змог да канца пераадолець пэўны схематызм ранейшых літаратуразнаўчых уяўленняў. І тады ў яго ўзнікае, напрыклад, меркаванне, што «Колас як празаік да рэвалюцыі сцвярджаў сябе ў рэчышчы крытычнага рэалізму, а пасля рэвалюцыі — у рэчышчы сацыялістычнага рэалізму». У адпаведнасці з патрабаваннямі і духам новага часу тут, відаць, павінны быць іншыя крытэрыі і ацэнкі.

Па-новаму глянуў у сваёй працы даследчык на «Казкі жыцця», якія, дарэчы, сам Колас ставіў поруч з паэмамі «Новая зямля» і «Сымон-музыка» і выказваў трывогу, чаму іх «крытыка абыходзіць глухім маўчаннем». І. П. Чыгрын пераканаўча паказаў фенаменальнасць «Казак жыцця», акрэсліў іх ролю і месца ў літаратурным працэсе, разгледзеў іх як адзіны цэльны твор.

Аўтар кнігі мае рацыю, калі падкрэслівае, што «Казкі жыцця» ствараліся на працягу паўстагоддзя, што першым творам цыкла з'яўляецца «Дудар» і што без гэтага алегарычнага апавядання немагчыма зразумець ні сам цыкл апавяданняў, ні ўвогуле творчасць Якуба Коласа.

І. П. Чыгрын апраўдана звяртае ўвагу і на тое, што вульгарна-сацыялагічнай крытыкай і літаратуразнаўствам так званых застойных гадоў «Казкі жыцця» часта вытлумачваліся прамалінейна і аднабакова. Ён доказна вядзе гаворку пра іх структуру і змест, дакладна вызначае ідэйна-мастацкую адметнасць, робіць заключэнне, што гэтыя творы, філасафічныя па зместу і алегарычныя па форме, «прысвечаны абмеркаванню агульназначных праблем чалавечага быцця, пазнанне якіх непасрэдна выцякае з праблем грамадскага ўсведамлення беларуса на канкрэтным этапе гістарычнага быцця».

Трылогія «На ростанях» (1921—1954) разглядаецца як наступны крок мастацка-жанравых пошукаў Коласа-празаіка. Даследчык і тут абапіраецца на думкі сваіх папярэднікаў, асобныя з іх прымае, асобныя аспрэчвае, выказвае свае адносіны да абранай праблемы. У прыватнасці, цікавымі ўяўляюцца разважанні аб жанравай прыналежнасці твора. Спаслаўшыся на самога Коласа, які ніколі не называў свой твор раманам, І. П. Чыгрын выказвае меркаванне аб правамернасці ха-

рактарызаваць гэту кнігу як раман з трох аповесцей.

Даследчыку ўяўляюцца катэгарычнымі сцвярджэнні беларускіх літаратуразнаўцаў аб тым, што трылогія — гэта твор пра народ і інтэлігенцыю. «Але трылогія,— піша І. П. Чыгрын,— не так пра тое, што інтэлігенцыя ў беларусаў ёсць, як пра тое, што яе няма, што яна патрэбна і як таго дамагацца. Твор пра тое, як яна можа ў нас з'явіцца. Калі шырэй, то пра тое, каб народ стаў народам». Аўтар даў сваё прачытанне твора.

І. П. Чыгрын з павагай і любоўю адносіцца да трылогіі, лічыць яе адным з лепшых твораў Якуба Коласа і ўвогуле беларускай літаратуры. Аднак, высока ацэньваючы мастацкія вартасці твора, ён, разам з тым, імкнецца быць аб'ектыўным у вызначэнні крытэрыяў, паводле якіх павінен ацэньвацца твор. У выніку прыходзіць да наступнага заключэння: «Прастора раманнай формы ў творчай спадчыне Якуба Коласа яшчэ не стала натуральнай патрэбай беларускай прозы як мастацтва слова. Да рамана Якуб Колас толькі ішоў». І такі вывад, думаецца, не прыніжае Якуба Коласа. Наадварот, ён глыбей дапамагае зразумець і ацаніць творчы і грамадзянскі подзвіг нашага класіка, які ў надзвычай складаныя і цяжкія часы змог пераадолець неймаверныя перашкоды і стварыць творы высокай мастацкай вартасці.

**А. Л. Верабей.**

Ada Vidovič-Muha. **Slovensko skladenjsko besedotvorje ob primerih zloženk.** Ljubljana, 1990. 223 с.

Монография А. Видович-Мухи, посвященная анализу сложных слов словенского языка,— важное событие в словенистике. Словообразовательная теория, развиваемая в исследовании, построена на понимании языка как системы, предполагающей наличие иерархически упорядоченных связей между ее элементами. По мнению автора, в процессе анализа особенностей образования сложных слов познаются причинно-следственные связи между синтаксисом и словообразованием, между словами и морфемами. В главах, посвященных словообразовательным моделям существительных, прилагательных и глаголов, вводится и определяется понятие «besedetvorne skladnje» (словообразовательный синтаксис), т. е. системно-языковая словесная связь, когда предметно- и грамматико-смысловые составляющие преобразуются в сложные образования. Словообразовательный синтаксис интересуют также все типы сложных основ с точки зрения грамматико-структурных или пропозиционных особенностей.

В исследовании А. Видович-Мухи раскрываются особенности сложных слов при помощи анализа словесных связей, из которых эти образования появились. Как полагает автор, через словообразовательную призму видятся многие значимые особенности сочетаемости рядов слов, а также особенности синтаксических связей.

В обширном историческом обзоре и отчасти в теоретическом вступлении критически анализируются работы словенских лингвистов. Словообразовательная теория, использованная в данной монографии, обнаруживает связь с традицией, придавая ей широту, которая исходит из единичных познаваемых возможностей. В основе применяемой теории лежит сознание того, что новое образование — это лишь преобразованный вариант определенной несинтаксической связи так называемой сложной основы. Словообразование по этой теории является той частью синтаксической проблемы, которая дает возможность на предметно- и грамматико-семантическом уровне связать ее с синтаксисом.

В частности, в качестве основного мерила деления сложных слов автор называет вид связи, который устанавливается между частями сложного слова. На основании этого сложные слова могут быть разделены на две группы: сложные слова, образующиеся при помощи подчинительной связи, и сложные слова, образующиеся при помощи сочинительной связи. Сложные слова, образованные на базе подчинительной связи, графически могут быть записаны таким образом: $X_1/X_2$, где $X_1$ — это ядро, а $X_2$ — зависимый компонент. Причем слова этой группы могут быть образованы при помощи интерфикса и суффикса либо только при помощи интерфикса. Сложные слова, образованные при помощи сочинительной связи, включают в свой состав равноправные основы. Графическая схема их, по мнению исследователя, может быть представлена следующим образом: $X_1+X_2+X_3$... Слова этой группы образуются также при помощи интерфикса и суффикса либо только при помощи интерфикса. Лексемы, образованные первым способом, включают в свой состав только основы прилагательных с последующим суффиксальным образованием -ski: balto-slovanski ← [ta, ki je povezan z] Balt [-i] {in} Slovan [-i], [ ] → -ski; { } → -o-, balt-, -slovan. Таких примеров мало и они, главным образом, как замечает автор, связаны с номинациями языков или народов (srbohrvatski ← povezan s Srbi in Hrvati). Сложные слова, образованные при помощи интерфикса, могут включать в свой состав основы существительных (sever-o- vzhod ← vzhod {ob} severu {-u}, { } → -o-, sever-, -vzhod) или основы прилагательных (turško-tatarski, belo-rdeč).

В монографии приводятся и рассматриваются разнообразные модели образования сложных существительных, прилагательных, глаголов. Кроме того, автор уделяет внимание вопросам акцентологии при образовании сложных слов. Анализируя работы предшественников по словенскому словообразованию, А. Видович-Муха вносит и свой вклад в разработку словообразовательной теории применительно к анализу образования сложных слов.

**В. А. Бельская**